# Замест персідскага ўзору...

**Кожны з нас можа назваць добры дзясятак сучасных беларускіх нацыянальных сімвалаў, што вызначаюць адметнасць Беларусі і характарызуюць лепшыя рысы нашага народа. А між тым і ў даўнія часы працавітасцю і талентам нашых продкаў ствараласяя нямала сапраўдных шэдэўраў, якія па сваёй мастацкай вартасці некалі стаялі ўпоравень з сусветна вядомымі брэндамі, такімі як, напрыклад, венецыянскае шкло, багемскі фарфор. І найперш гэта – легендарныя слуцкія паясы.**

## У пагоні за модай

Спрадвеку пояс з'яўляўся неад'емнай часткай мужчынскага касцюма нашых продкаў. Ён шырока выкарыстоўваўся імі як у паўсядзённым жыцці, так і ў святочных строях і мог быць якім заўгодна: аборчатым, скураным, тканым, сабраным з розных упрыгажэнняў і нават плеценым з кары. Згодна з народнымі павер'ямі, пояс валодаў цудадзейнай сілай, спрыяў дастатку, аберагаў ад хвароб, адганяў нячыстую сілу. З яго дапамогай мужчыны яшчэ і падкрэслівалі свой высокі сацыяльны статус і жыццёвую ўпарадкаванасць.

Асаблівая магічная роля надавалася беларусамі і тканым паясам. Імі перавязвалі спавітае дзіця адразу пасля нараджэння, і гэта нібыта гарантавала яму шчаслівае жыццё. Тканымі каляровымі паясамі маладая на вяселлі абвязвала свайго суджанага і яго сваякоў. Іншым разам багата аздобленыя паясы клалі разам з іх уладальнікам-нябожчыкам у труну. Служылі яны і ў якасці ахвяраванняў царкве ці касцёлу.

З цягам часу тканы пояс стаў для нашых продкаў яшчэ і сімвалам улады і багацця. Прынамсі, прыкладна ў XVI стагоддзі ў асяроддзі знаці Вялікага Княства Літоўскага ўваходзіць у моду кунтуш – верхняе мужчынскае адзенне ў выглядзе даўгаполага (ніжэй за калені) кафтана, якое насілася напаўзашпіленым паверсе жупана. Абавязковым элементам гэтага строю якраз і з'яўляўся шырокі так званы кунтушовы пояс, які абгортваўся вакол таліі некалькі разоў. Спрабуючы паспець за модай, заможныя людзі імкнуліся мець ва ўласным гардэробе менавіта такія адметныя паясы, якія б падкрэслівалі іх асабістую выключнасць. Свае ж даматканыя, аздобленыя традыцыйнымі арнаментамі, для гэтых мэт ужо не падыходзілі, бо, паводле меркавання многіх, былі не моднымі. Менавіта па гэтай прычыне іх паступова і выціснілі з ужытку найперш у магнацкім асяроддзі вырабы замежных майстроў ткацкіх спраў.

Вяртаючыся з ваенных паходаў альбо далёкіх заморскіх падарожжаў, прадстаўнікі вышэйшага і сярэдняга саслоўяў Вялікага Княства Літоўскага сталі прывозіць з сабой на радзіму па-мастацку вытканыя ў Асманскай імперыі, Персіі, Кітаі ці іншых усходніх краінах шаўковыя паясныя тканіны. Гэтыя вырабы вылучаліся нетрадыцыйнай колеравай гамай, былі ўпрыгожаны разнастайнымі ўсходнімі ўзорамі і арнаментамі, дзіўнымі раслінамі і кветкамі, а асобныя з іх аздабляліся яшчэ і залатымі і сярэбранымі ніткамі. Паколькі ў ВКЛ і ў Польшчы на іх быў пэўны попыт, то з часам заморскія паясы сталі з'яўляцца і на рынках буйных гарадоў. Аднак прыдбаць іх мог далёка не кожны: прывазныя турэцкія або персідскія паясы каштавалі надзвычай дорага. Напрыклад, тагачасны афіцэр мог набыць сабе такое ўпрыгажэнне, толькі сабраўшы ў адно ўвесь свой гадавы заробак.

Але з часам некаторыя велікакняжацкія і польскія прадпрымальнікі і магнаты, відаць, папярэдне добра вывучыўшы кан'юнктуру рынку, пачалі запрашаць усходніх майстроў і наладжваць з іх дапамогай па заморскіх узорах выраб шаўковых паясных тканін у сябе на радзіме. У прыватнасці, такія ткацкія мануфактуры ў пачатку XVIII стагоддзя былі заснаваны на тэрыторыі цяперашняй Украіны – у Станіславе (сённяшні Івана-





▲ У час адкрыцця выставы слуцкіх паясоў у Дзяржаўным літаратурным музеі Максіма Багдановіча ў Мінску. 2013 год

Франкоўск) і Львове. Паясы практычна не адрозніваліся ад прывезеных з Блізкага Усходу, але былі крыху таннейшыя, таму і карысталіся павышаным попытам.

На тэрыторыі ж сучаснай Беларусі выраб кунтушовых паясоў на персідскі ўзор першымі ініцыіравалі небезвядомыя князі Радзівілы. Праўда, зрабілі яны гэта пасля таго, як львоўская і станіслаўская «фабрыкі шаўковых паясоў» напоўніцу разгарнулі сваю вытворчасць. Аднак менавіта паясам, вырабленым на радзівілаўскай мануфактуры, суджана было ўвайсці ў гісторыю як арыгінальным і высокамастацкім творам ткацкага майстэрства і тым самым здабыць вядомасць ва ўсім свеце.

## Самі з вусамі

Прыкладна на пачатку 40-х гадоў XVIII стагоддзя нясвіжскі ардынат Міхал Казімір Радзівіл, вядомы яшчэ і па мянушцы Рыбанька, таксама паддаўся неймавернаму ажыятажу, які існаваў найперш у Рэчы Паспалітай вакол кунтушовых паясоў, і запрасіў да сябе з Персіі і Турцыі майстроў па іх вырабе. Заснаваная з дапамогай заморскіх ткачоў у Нясвіжы мануфактура праіснавала каля дваццаці гадоў.

Аднак прадбачлівы Рыбанька не стаў разлічваць толькі на персідскіх ды турэцкіх майстроў, а неўзабаве накіраваў у Станіслаў двух сваіх прыдворных мастакоў Тамаша Хаецкага і Яна Гадоўскага, якія, авалодаўшы там прамудрасцямі новай для іх шоўказалататкацкай справы, пасля пэўны час пасляхова кіравалі вытворчасцю на Нясвіжскай мануфактуры. Дарэчы, менавіта ім некаторымі даследчыкамі старадаўняга ткацкага мастацтва прыпісваецца і стварэнне ўзору першых адрозных ад завезеных з Блізкага Усходу, скажам так, непасрэдна айчынных кунтушовых паясоў. Іх спроба злучыць усходнія матывы з традыцыйнымі ўзорамі, якія шырока выкарыстоўваліся ў народным ткацтве, аказалася даволі ўдалай. Прынамсі, гаспадарчыя рэестры Нясвіжскай ардынацыі сведчаць, што Міхал Казімір Радзівіл ахвотна дарыў розным вяльможам «персідскія паясы», зробленыя ў Нясвіжы.

Істотна новы віток у дзейнасці Нясвіжскай мануфактуры шаўковых паясоў звязаны з імем Яна Маджарскага. Гэта быў даволі таленавіты майстар, які спасцігаў сакрэты ткацкага майстэрства і атрымаў высокую прафесійную загартоўку на лепшых турэцкіх мануфактурах. Паходзіў ён са Стамбула, але меў армянскія карані. Між іншым, сапраўднае яго імя Аванэс Маджаранц. Менавіта з ім падчас сваёй стажыроўкі ў Станіславе, дзе на той час працаваў гэты майстар, зблізіліся радзівілаўскія пасланцы Т. Хаецкі і Я. Гадоўскі. З іх падказкі Рыбанька і стаў настойліва пераманьваць А. Маджаранца да сябе ў Нясвіж. Але згода на пераезд была атрымана ад майстра толькі ў канцы 1757 года, і ўжо на пачатку наступнага года ён стаў кіраўніком Нясвіжскай мануфактуры, у функцыі якога таксама ўваходзіла і навучанне персідскаму ткацкаму рамяству

прызначаных для гэтага князем нясвіжан і жыхароў навакольных вёсак. Менавіта тады, разам са зменай месца свайго жыхарства, А. Маджаранц афіцыйна перайначыў на тутэйшы лад сваё імя і прозвішча.

У адрозненне ад Станіслаўскай мануфактуры, дзе на той час строга захоўваліся традыцыі турэцкіх майстроў, у Нясвіжы Я. Маджарскі атрымаў значна больш магчымасцей для ажыццяўлення сваіх творчых задум. Абапіраючыся на ўжо існуючыя на тамтэйшай мануфактуры напрацоўкі па вырабе адметных, не падобных на турэцкія ці персідскія, паясоў, ён, паводле сцвярджэння сучасных даследчыкаў тэорыі ткацтва, пайшоў на яшчэ больш смелыя эксперыменты – стаў выкарыстоўваць у арнаменце паясоў матывы такіх папулярных тады ў Заходняй Еўропе стыляў, як барока, ракако, класіцызм, не грэбаваў пры гэтым, відаць, па падказцы нясвіжскіх мастакоў-дызайнераў, і мясцовымі мастацкімі матывамі.

Акрамя гэтага, з дапамогай Я. Маджарскага са Стамбула ў Нясвіж былі тайна па частках дастаўлены спецыяльны каток для пракачвання залататканых паясоў і дэталі шаўковага станка: баючыся канкурэнцыі сваіх паясоў і вырабаў еўрапейскіх майстроў, туркі пад пагрозай смерці забаранялі вываз за межы дзяржавы ткацкага абсталявання. На ўзор турэцкіх мясцовыя майстры затым зрабілі некалькі арыгінальных станкоў, што дало магчымасць павялічыць колькасць прадукцыі, пашырыць яе асартымент і значна палепшыць якасць. Такім чынам, была закладзена надзейная аснова вытворчага працэсу, а затым і сфарміраваны агульны стыль, мастацкая структура і колеравы дэкор кунтушовых паясоў, за якімі пазней трывала замацавалася назва – «слуцкія».

Трэба зазначыць, што ў другой чвэрці XVIII стагоддзя буйным цэнтрам ткацтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі з'яўляўся і недалёкі ад Нясвіжа Слуцк. Там існавалі даволі даўнія традыцыі ткацкага майстэрства, якія перадаваліся случанамі з пакалення ў пакаленне. Гэта ў свой час улічыў малодшы брат Рыбанькі Геранім Фларыян Радзівіл, які стаў апекавацца дзейнасцю адразу некалькіх слуцкіх мануфактур. Іх прадукцыя была даволі разнастайнай – ад традыцыйных паясоў, ручнікоў, стужак і кілімаў да пазументаў – тасьмы, вышытай сярэбранымі ніткамі, і залачоных нашывак-галуноў для вайсковых мундзіраў і парадлага адзення.

На пачатку 50-х гадоў XVIII стагоддзя па прыкладу свайго брата Г. Радзівіл таксама задумаў заняцца вырабам залататканых кунтушовых паясоў паводле «персідскага ўзору». Для гэтых мэт ён нават пабудаваў у Слуцку на Сенатарскай вуліцы (цяпер Камсамольская) прасторныя вытворчыя памяшканні. Аднак разгарнуцца пад яго апекай новая Слуцкая шаўкаткацкая мануфактура не паспела – у 1760 годзе Геранім Фларыян Радзівіл заўчасна, у 45-гадовым узросце, памёр. Пасля гэтага спадчыннікам яго слуцкай маёмасці становіцца старэйшы брат. Зразумела, што Міхал Казімір

▼ **Слуцкія паясы з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Літвы ў 2012 годзе экспанаваліся ў Мінску**





Радзівіл не мог не скарыстаць слуцкія ткацкія майстэрні для пашырэння даволі прыбытковай справы. Але ўтрымліваць аднатыпныя прадпрыемствы адначасова ў двух гарадах ён палічыў немэтазгодным, таму і перавёз сваю Нясвіжскую мануфактуру па вырабе паясоў у Слуцк. Кіраваць жа аб'яднанай вытворчасцю князь прызначыў Яна Маджарскага.

## «Мяне зрабіў Слуцк»

Стараннямі Я. Маджарскага і яго памочнікаў Слуцкая персіярня (менавіта пад такой назвай яна найчасцей згадвалася як у мове мясцовых жыхароў, так і ў афіцыйных дакументах) за кароткі тэрмін ператварылася ў даволі сучаснае на свой час прадпрыемства. Яго прадукцыя, хоць і была па-ранейшаму нятаннай, заваёўвала ўсё большую вядомасць у Рэчы Паспалітай. Паясы, вытканыя ў Слуцку, лічылі за гонар мець ва ўласным гардэробе не толькі польскія і беларускія магнаты і шляхта, але і манархі большасці еўрапейскіх краін. Такая вялікая папулярнасць слуцкіх паясоў паспрыяла выцясненню практычна з усяго еўрапейскага рынку аднатыпнай заморскай прадукцыі.

Калі меркаваць, што на Слуцкай персіярні штогод выпускалася да 200 паясоў, а пра гэта ёсць згадкі ў архіўных крыніцах, то на выраб аднаго з іх прыпадала ў сярэднім паўтара дня. На самай жа справе слуцкія паясы з'яўляліся на свет за значна больш працяглы час. Бо, па-першае, адначасова працаваў не адзін, а некалькі станкоў. А, па-другое, вытворчыя тэмпы вельмі моцна залежалі ад кваліфікацыі майстра і складанасці прадстаўленага яму для вырабу ўзору.

Нягледзячы на тое, што мастацкая аснова слуцкага пояса была сфарміравана яшчэ на Нясвіжскай мануфактуры і да гэтага працэсу, як згадвалася, паспеў прыкласці руку сам Я. Маджарскі, у Слуцку майстар не задаволіўся дасягнутым, а працягваў працу над удасканаленнем узораў сваіх залататканых вырабаў. У выніку на працягу 60–70-х гадоў XVIII стагоддзя склаўся класічны тып слуцкага пояса: так званы «сярэднік» з палосамі і лёгкім вытанчаным арнаментам, два цяжкія канцы («галовы»), на якіх у прамавугольных клеймах размяшчаліся сіметрычныя выявы букетаў кветак і




▲ Слуцкі пояс са сваёй «фірменнай» меткай

розныя іншыя раслінныя матывы, былі ўпрыгожаныя махрамі. Па ўсёй даўжыні з двух бакоў паясы мелі яшчэ і аблямоўку. Велічыня «сярэдніка» суадносілася да «галавы» прыблізна як 1:16. Даўжыня ж слуцкіх паясоў вагалася ад 2 да 4,8 метра, па шырыні яны таксама былі розныя – ад 20 да 40 сантыметраў.

Паводле свайго ніткавага складу слуцкія паясы падзяляліся на «простыя», «паўлітыя» і «літыя». Усё залежала ад матэрыялу: «простыя» вырабляліся толькі з шаўковых нітак, у «паўлітых» да шаўковых дадаваліся залатыя і сярэбраныя ніткі ў асноўным для аздаблення арнаментаў, «літыя» ж былі асабліва каштоўнымі і найбольш працаёмкімі. Яны мелі гладкую бліскучую паверхню, якая дасягалася залотнай ніткай, што закрывала шаўковую аснову. Залотныя ніткі ў сваю чаргу расплюшчваліся пракачваннем праз металічныя валы – каляндры. «Літыя» паясы таксама змяшчалі металічныя ніткі ў арнаменце і фоне. Правы іх бок быў цалкам затканы залатой ніткай – яна закрывала шаўковую аснову.

Слуцкія паясы ткаліся ў самых розных колеравых спалучэннях. Але найбольш распаўсюджанымі былі: аранжавы з сінім і залаціста-жоўтым; аранжавы з карычневым і жоўтым; ружовы з блакітным, зялёным і залацістым; ярка-чырвоны з залаціста-жоўтым, чорным, сінім і зялё-

ным. Пры гэтым у некаторыя гарманічна ўзаемазвязаныя колеравыя адценні часам «упляталіся» кампазіцыі з ружова-блакітных кветак і зялёнага лісця дрэў.

Па сваім кампазіцыйным складзе слуцкія паясы падраздзяляліся на двухбаковыя (адзін іх бок, звычайна вонкавы, быў выкананы ў светлых колерах, а адваротны – у цёмных) і чатырохбаковыя (па ўсёй даўжыні яны былі падзелены на дзве палавіны з утком – папярочнымі адносна аблямоўкі ніткамі – markнага колеру). Імі падпярэзвалі кунтушы на той ці іншы бок у залежнасці ад жыццёвых акалічнасцей: скажам, ідучы на вяселле – светлым, а на пахаванне – цёмным.

Арыгінальным у гэтым плане быў чатырохбаковы слуцкі пояс. Ён, згорнуты папалам, мог ужывацца ў чатырох розных колеравых гамах. Гэтай яго ўласцівасцю, між іншым, даволі часта злоўжывалі малазямельныя і асабліва ганарлівыя шляхціцы, якія, практычна не маючы за душой ні граша, выхваляліся, што ў іх гардэробе ёсць не менш як чатыры слуцкія паясы. На самай жа справе быў усяго адзін, ды і той дастаўся ў спадчыну, напрыклад, ад ашчаднага і гаспадарлівага дзеда.



Пры Я. Маджарскім вытканыя слуцкімі майстрамі паясы, як правіла, пазначаліся ўласнымі «фірменнымі» меткамі: «Sluck», «Sluciae», «IAANES MADZARSKI», «JOANES MADZARSKI», «Sluciae fecit», «Me fecit Sluciae» (два апошнія перакладаюцца з латыні адпаведна як «Зрабіў Слуцк» і «Мяне зрабіў Слуцк»). Пасля таго як у канцы XVIII стагоддзя Слуцк разам з усёй этнічнай тэрыторыяй Беларусі быў далучаны да Расійскай імперыі, на паясах, выробленых на мясцовай персіярні, тады, дарэчы, ёю ўжо кіраваў сын Я. Маджарскага Лявон, пачалі з'яўляцца меткі і ў рускай транскрыпцыі. Яны ткаліся як лацінскімі літарамі, так і кірыліцай: «Wo gradae» – «Sluciae»; у верхнім радку – «ЛЕО МА», у ніжнім – «ЖАРСКИЙ», а з другога боку ў верхнім радку – «ВЪ ГРАДЪ», у ніжнім – «СЛУЦКЪ», а таксама «В ГРАДЪ СЛУЦКЪ» альбо «ВЪ ГРАДЪ СЛУЦКЪ».

## Арыгіналы і падробкі

Аднак не ўсё так ціхамірна было ў дзейнасці Слуцкай персіярні. У 1776 годзе чарговы кіраўнік Нясвіжскай ардынацыі Караль Станіслаў Радзівіл, вядомы яшчэ і як Пане Каханку, вырашаў адысці ад шчыльнай апекі прадстаўнікоў свайго роду над дзейнасцю Слуцкай мануфактуры і перадаў яе ў арэнду Я. Маджарскаму. Пасля гэтага на плечы апошняга лёг не толькі вытворчы працэс, але і забеспячэнне прадпрыемства якаснай сыравінай, у тым ліку залатымі і сярэбранымі ніткамі, а іх на выраб аднаго пояса магло спатрэбіцца да 200–300 грамаў. Праўда, з усім гэтым таленавіты майстар і адміністратар паспяхова справіўся і без радзівілаўскай падтрымкі, і мануфактура па-ранейшаму працягвала прыносіць прыбытак. Дарэчы, пасля падпісання арэнднага дагавора К. Радзівіл вымушаны быў набываць паясы ў Я. Маджарскага за грошы альбо браць іх у лік арэнднай платы: яна складала каля 10 тысяч злотых у год.

І тым не менш у 1781 годзе Я. Маджарскі перадаў арэндныя правы на Слуцкую персіярню свайму 30-гадоваму сыну Лявону, які не толькі паспяхова прадоўжыў распачатую бацькам вытворчасць, але з часам унёс пэўныя ўдасканаленні ў дэкор і колеравае вырашэнне слуцкіх паясоў. Прынамсі, як сцвярджае вядомы беларускі мастацтвазнавец Мая Яніцкая, ён увёў складаную сістэму паслядоўных комплексаў палос, якія кантраставалі паміж сабой на падставе памераў, колераў і арнаменту, а таксама выкарыстаў супрацьпастаўленне геаметрычных і раслінных арнаментаў. Паясы, выробленыя за часам Л. Маджарскага, мелі больш яркія колеравыя тоны, усе элементы кветкавых кампазіцый «галоў» і арнаменты палос, а таксама непасрэдна паясная аблямоўка выдзяляліся чорным контурам.

Папулярнасць слуцкіх паясоў не давала спакою пэўнаму колу знаці Рэчы Паспалітай, асабліва пасля таго, як К. Радзівіл адмовіўся ад сваёй апекі над дзейнасцю персіярні і перадаў яе ў арэнду. Найбольш увішныя магнаты ў спадзяванні на вялізныя прыбыткі пачалі ствараць уласныя ткацкія мануфактуры, на якіх сталі вырабляць паясы па слуцкаму тыпу – у іх захоўвалася агульная кампазіцыя і толькі зрэдку ўносіліся нязначныя змены ў арнаментацыю палос і «галоў» і ў агульны колеравы каларыт. Пры гэтым такія, калі браць па вялікім рахунку, падробкі аздабляліся тымі ж меткамі, што і слуцкія паясы.

У межах сучаснай Беларусі пад слуцкім брэндам выраблялiся паясы ў вёсках Га-

радніца і Ласосна каля Гродна, у Ружанах, Паставах, Карэлічах, Слоніме і Шклове. На польскай тэрыторыі – у Кабылках і Ліпкаве пад Варшавай, у Кракаве і Гданьску. Таксама копіі слуцкіх паясоў ткаліся на некаторых мануфактурах, размешчаных у заходняй Украіне, і нават – на ткацкіх прадпрыемствах французскага Ліёна.

Аднак копіям не ўдалося перасягнуць славу арыгіналаў. Слуцкія паясы аказаліся па-за канкурэнцыяй, бо былі найбольш якаснымі і дасканалымі ў мастацкіх адносінах. Дарэчы, паводле сведчання той жа М. Яніцкай, у 70–90-х гадах мінулага стагоддзя польскія даследчыкі скрупулёзна вывучалі тэхналогію паясоў, выробленых як непасрэдна ў Слуцку, так і на іншых мануфактурах пад брэндам «Sluciae fecit». Іх высновы былі такія – паясы слуцкай вытворчасці адрозніваюцца ад іншых уласнай тэхналогіяй.

Што ж тычыцца далейшага лёсу Слуцкай персіярні, то пад кіраўніцтвам Л. Маджарскага яна прапрацавала да 1807 года. Адмовіцца ад яе арэнды майстра прымусіла рэзкае змяншэнне попыту на слуцкія паясы. Справа ў тым, што пасля падзелаў Рэчы Паспалітай расійскія ўлады забаранілі нашэнне кунтушоў, якія асацыіраваліся ў іх з пратэснымі настроямі мясцовай знаці, яе незадаволенасцю новымі парадкамі. А паколькі зніклі з ужытку кунтушы, то адпала неабходнасць і ў залачоных паясах...

Наступным пасля Я. Маджарскага інтэндантам Слуцкай мануфактуры значыўся яе былы пісар Тамаш Барсук. Пры ім персіярня стала выпускаць паясы толькі пад заказ (а іх было мізэрна мала) і была перапрафілявана на выпуск парчовых узорыстых і залататканых тканін, прызначаных галоўным чынам для патрэб касцёлаў і цэркваў. У 1835 годзе ткацкае прадпрыемства ў Слуцку перайшло ў арэнду да мясцовых ткачоў Юзафа і Піліпа Дубіцкіх, а ў 1848-м яно наогул было закрыта.

## Пра што не ведаў Максім Багдановіч?

Цікавасць да вырабаў Слуцкай персіярні выйшла на новы віток у другой палове XIX стагоддзя. На гэты раз на іх звярнулі ўвагу калекцыянеры і рознага кшталту махляры. Яны скуплялі шаўковыя, «літыя» і «паўлітыя» слуцкія паясы, што захоўваліся ў магнацкіх палацах і шляхецкіх маёнтках як радавыя рэліквіі. Аднак затым іх погляды на вартасць гэтых каштоўнасцей разыходзіліся. Калі першыя ўгаворвалі шляхціцаў прадаць ім паясы, бо бачылі ў іх высокамастацкія творы, то другія імкнуліся да асабістага абагачэння: яны проста спальвалі каштоўную рэч і такім чынам здабывалі золата і серабро (можна было атрымаць да 300 грамаў у залежнасці ад тыпу пояса). І, мяркуючы па тым, што сёння засталося наогул не так ужо і шмат слуцкіх паясоў, то махляры-марадзёры ў сваіх дзеяннях перасягнулі заўзятараў прыгожага.

Цяжка ўявіць, які наогул лёс напаткаў бы слуцкія паясы, калі б на пачатку XX стагоддзя іх у якасці аднаго са сваіх сімвалаў не выбралі ўдзельнікі беларускага нацыянальнага адраджэння. Менавіта дзякуючы ім вырабы Слуцкай персіярні тады пачалі заваёўваць сваё ганаровае месца ў грамадскай свядомасці беларусаў. Некалькі слуцкіх паясоў (пад такой назвай яны былі запісаны ў інвентарнай кнізе) знаходзіліся і ў калекцыі тагачаснага палітычнага дзеяча Івана Луцкевіча, якая склала аснову будучага Беларускага музея, заснаванага ў сённяшняй літоўскай сталіцы на пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Менавіта іх і ўбачыў летам 1911 года Максім Багдановіч у рэдакцыі газеты «Наша Ніва» падчас адзінай ў сваім жыцці паездкі ў Вільню. Унікальныя залататканыя вырабы зачаравалі паэта і натхнілі на напісанне верша «Слуцкія ткачыхі».

Гэты твор у далейшым стаў адным з галоўных папулярызатараў слуцкіх паясоў, нягледзячы на значныя памылкі аўтара ў трактоўцы пэўных гістарычных рэалій. Так, на Слуцкай персіярні ткалі паясы выключна мужчыны – М. Багдановіч жа ўвёў вобраз «бяздольных» дзяўчат, узятых «ад родных ніў, ад роднай хаты ў панскі двор... ткаць залатыя паясы». Паводле сцвярджэння даследчыкаў ткацкага мастацтва, на слуцкіх паясах адлюстравана некалькі відаў кветак, характэрных для беларускай флоры, але згаданы паэтам «цвяток радзімы» васілёк сярод іх не значыцца. І яшчэ. М. Багдановіч сцвярджае, што той самы васілёк прыгонныя дзяўчаты ткалі «заміж персідскага ўзору». На самай жа справе малюнак любога пояса ўзгадняўся загадзя, рабіўся эскіз вырабу, па якім затым і ткаўся «залаты пояс».



Аднак гэтыя недакладнасці, на якія, дарэчы, паэт М. Багдановіч цалкам меў права, бо «Слуцкія ткачыхі» – мастацкі, а не навукова-гістарычны твор, ніяк не паўплывалі на папулярнасць верша. Яго тэма і вобразы ў савецкія часы трактаваліся як яскравая ілюстрацыя феадальнага прыгнёту беларускага народа ў мінулым і атрымалі шырокае распаўсюджанне не толькі ў школьных падручніках, але і ў навукова-папулярных выданнях і нават у выяўленчым мастацтве.

Але пры гэтым – дзіўны парадокс – пэўны перыяд паўнавартасных слуцкіх паясоў у Беларусі за савецкім часам практычна не было. У 1939 годзе, пасля далучэння заходнебеларускіх тэрыторый да БССР, 32 паясы з радзівілаўскай калекцыі Нясвіжскага замка былі перададзены ў Беларускую карцінную галерэю ў Мінску (сучасны Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь). І яны ў 1940 годзе нават дэманстраваліся ў Маскве. Але затым, пасля вяртання ў Беларусь, былі страчаны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенны час у беларускіх музеях захоўваліся толькі фрагменты слуцкіх паясоў. Пазней сітуацыя пачала мяняцца, і на сённяшні дзень у музейных установах Беларусі знаходзіцца ўжо каля дзясятка гэтых паўнавартасных рарытэтаў. Іх можна пабачыць у экспазіцыях Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Музеі старажытнабеларускай культуры




Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, Дзяржаўным літаратурным музеі Максіма Багдановіча і Мінскім абласным краязнаўчым музеі ў Маладзечне. Спробу займець у сваіх фондах два адметныя слуцкія паясы зрабілі і на іх радзіме ў Слуцку – летась мясцовы краязнаўчы музей аб'явіў збор грашовых сродкаў на гэтыя мэты.

Аднак так склалася, што значныя калекцыі слуцкіх паясоў цяпер захоўваюцца па-за межамі Беларусі: у Маскве (Дзяржаўны гістарычны музей Расійскай Федэрацыі), Санкт-Пецярбургу (Рускі музей, Расійскі этнаграфічны музей, Дзяржаўны Эрмітаж), Львове (Львоўскі гістарычны музей, Музей этнаграфіі і мастацкага промыслу Акадэміі навук Украіны), Варшаве і Кракаве (нацыянальныя музеі Рэспублікі Польшча), Вільнюсе (Нацыянальны мастацкі музей Літвы), а таксама ў музеях Познані, Плоцка, Гданьска, Каўнаса, Кіева…

У апошнія гады, дзякуючы супрацоўніцтву Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь з музейнымі ўстановамі іншых краін, у Мінску прайшлі выставы слуцкіх паясоў з Дзяржаўнага гістарычнага музея Расійскай Федэрацыі і Нацыянальнага мастацкага музея Літвы ў Вільнюсе. А на пачатку гэтага месяца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адкрылася чарговая такая выстава: на гэты раз экспанаты прыехалі з Львоўскага гістарычнага музея. У экспазіцыі прадстаўлены чатыры паясы: тры з іх былі вытканы на Слуцкай мануфактуры перыяду Лявона Маджарскага (два маюць пазнакі «Въ градъ Слуцкъ»), адзін – на фабрыцы Францішка Маслоўскага ў Кракаве. Таму ў наведвальнікаў ёсць унікальная магчымасць параўнаць непасрэдна слуцкія паясы з тымі, якія выпускаліся пад іх брэндам.

## Сімвал краіны

Безумоўна, слуцкія паясы з'яўляюцца выдатнымі творамі не толькі беларускага, але і еўрапейскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва XVIII–XIX стагоддзяў. Яны ўвасобілі ў сабе мастацкі талент беларускага народа і сталі адным з сімвалаў нашай дзяржавы. Акурат гэтую іх уласцівасць падкрэсліў у сваім леташнім Пасланні бе-

ларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь Прэзідэнт краіны А. Лукашэнка: «Адраджэнне значных культурных і гістарычных сімвалаў, выхаванне патрыятызму, любові і павагі да сваёй Радзімы на аснове багатага культурнага і гістарычнага багажу краіны, якім усе беларусы павінны заслужана ганарыцца, – гэта важная частка фарміравання і развіцця нацыянальнай ідэі. Слуцкія паясы лішні раз нагадваюць нам простую ісціну: шчаслівае тое грамадства, у якім гарманічна сплятаюцца духоўныя каштоўнасці і матэрыяльныя сілы, традыцыі і навацыі, мінулае і будучае».

Прэзідэнт па сутнасці падтрымаў ідэі прадстаўнікоў беларускіх творчых колаў, якія выказваліся за адраджэнне слуцкіх паясоў як брэнду нашай краіны. Таму была распрацавана і ў канцы мінулага года зацверджана Саветам Міністраў краіны Дзяржаўная праграма адраджэння тэхналогій і традыцый вытворчасці слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012–2015 гады. Яна ўяўляе сабой комплексную сістэму мер па рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы захавання традыцый і развіцця беларускага мастацтва, народных мастацкіх промыслаў, у тым ліку і правядзенне даследаванняў гісторыі ўзнікнення, мастацкіх асаблівасцяў і характарыстык аўтэнтычных слуцкіх паясоў на аснове мясцовай прадукцыі XVIII – пачатку XIX стагоддзя, вывучэнне матэрыялаў, якія выкарыстоўваліся ў тагачаснай вытворчасці, і распрацоўку прапаноў па іх замене ў сучасных умовах прамысловай вытворчасці. Зразумела, што галоўным этапам ажыццяўлення праграмы павінна стаць арганізацыя работы па адраджэнні вырабу аналагаў слуцкіх паясоў, а таксама іх копій і мастацкіх стылізацый.

Як адзначылі ў вытворча-гандлёвым аб’яднанні «Белмастацпромыслы» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якое з’яўляецца адным з асноўных выканаўцаў згаданай праграмы, адраджэнне тэхналогій і традыцый вытворчасці слуцкіх паясоў прадугледжвае шэраг практычных задач, і асноўныя з іх ужо рэалізуюцца. У прыватнасці, падпісаны дагавор на пастаўку ў Слуцк на Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Слуцкія паясы» ткацкага абсталявання германскай фірмы «Магеба». На аснове аўтэнтычнага пояса, які захоўваецца ў фондах Музея старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, спецыялістамі Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта распрацавана тэхналогія вытворчасці аналагаў вырабаў колішняй Слуцкай ткацкай мануфактуры. І ўжо ў другой палове гэтага года, як плануецца, будзе выпушчаны першы «асучаснены» слуцкі пояс.

– Аналагі слуцкіх паясоў – гэта штучныя вырабы, у якіх будуць захоўвацца максімальна дакладныя тэхналогія, тэхніка і матэрыялы, – адзначае загадчык аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі кандыдат мастацтвазнаўства Барыс Лазука. – Толькі такі пояс, вытканы з натуральнага шоўку, залатых і сярэбраных нітак, будзе адпавядаць гістарычнаму ўзору і ўяўляць цікавасць для музеяў. Такія вырабы не сорамна выкарыстоўваць і ў прадстаўніцкіх мэтах на міждзяржаўных мерапрыемствах, афіцыйных прыёмах высокіх замежных гасцей і г.д.

На думку навукоўца, разам з аўтэнтычнымі слуцкімі паясамі шырокім попытам будуць карыстацца і іх копіі, вырабленыя з матэрыялаў-заменнікаў, – для іх выпуску таксама ўжо распрацавана тэхналогія. Запланаваны і выпуск рознай сувенірнай прадукцыі, аздобленай мастацкімі ўзорамі ў стылі слуцкага пояса.

Безумоўна, пакуль не наладжана практычнае ажыццяўленне Дзяржаўнай праграмы адраджэння тэхналогій і традыцый вытворчасці слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі «Слуцкія паясы» на 2012–2015 гады, гаварыць пра яе здабыткі ці пралікі рана. Але відавочна, што гэты праект нельга разглядаць толькі з пункту гледжання практычнай выгады, прагматызму. Дзяржпраграма «Слуцкія паясы» будзе садзейнічаць далейшаму развіццю ў Беларусі адметных мастацкіх промыслаў, прыцягненню цікавасці замежнікаў да нашай краіны. Ну і хочацца спадзявацца, што, дзякуючы гэтаму праекту, слуцкія паясы набудуць для ўсіх нас новае культурна-духоўнае значэнне, а іх сусветная вядомасць, як аднаго з сімвалаў Радзімы, пашырыцца яшчэ больш.

**Сяргей ГАЛОЎКА**

